НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Дзяржаўная навуковая ўстанова
«ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ
І ЛІТАРАТУРЫ НАН БЕЛАРУСІ»

філіял «ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І
ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ»

# МІКАЛАЙ ШЧАКАЦІХІН:
## да 125-годдзя з дня нараджэння

(Матэрыялы круглага стала,
Мінск, 4 лістапада 2021 г.)

Мінск
«Права і эканоміка»
2022

УДК 39 (=161)
ББК 63.5
М59

Рэдакцыйная калегія:
А. І. Лакотка (галоўны рэдактар),
А. С. Шамрук, Т. Г. Гаранская, А. С. Сардараў

Укладальнікі:
А. Г. Алфёрава, І. І. Балуненка

М59 **Мікалай** Шчакаціхін : да 125-годдзя з дня нараджэння (Матэрыялы круглага стала, Мінск, 4 лістапада 2021 г.) / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры; гал. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2022. – 62 с.
ISBN 978-985-887-003-4.

У зборніку змешчаны даклады ўдзельнікаў круглага стала, прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння М. М. Шчакаціхіна і праведзенага 4 лістапада 2021 г. у Інстытуце мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі імя К. Крапівы НАН Беларусі. У матэрыялах адлюстраваны ўклад даследчыка ў развіццё сучаснага мастацтвазнаўства.

Адрасуецца мастацтвазнаўцам, архітэктарам і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускага мастацтва.

**УДК 39 (=161)**
**ББК 63.5**

**ISBN 978-985-887-003-4**

© ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”, 2022
© Афармленне. ВТАА “Права і эканоміка”, 2022

# ЗМЕСТ

*Лакотка А. І.* Матэрыялы круглага стала, прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння Мікалая Мікалаевіча Шчакаціхіна 4
*Віннікава М. М.* Значэнне навукова-метадычных распрацовак М. М. Шчакаціхіна для сучаснага мастацтвазнаўства і музейнай практыкі 5
*Трусаў А. А.* Мікола Шчакаціхін – першы даследчык беларускага мастацтвазнаўства 11
*Иванов Ю. С.* Наследники Николая Щекатихина 14
*Пікулік А. М.* М. Шчакаціхін – даследчык магілёўскай школы гравюры 15
*Габрусь Т. В.* Краевугольны камень беларускага мастацтвазнаўства: да 125-годдзя Міколы Шчакаціхіна 19
*Баженова О. Д.* Николай Щекатихин: анализ формы как основа конституализации белорусского искусства 24
*Усова Н. М.* Об истории одного незавершённого проекта. Издание рукописей «Очерк истории литовской монеты XVI – XVII столетий» и «Топография кладов с литовскими монетами на территории древнего Литовского государства» Н. Н. Щекатихина 33
*Сардараў А. С.* Навуковая пазіцыя вучонага 46
*Фотаальбом* 48

*Лакотка А. І.*

# МАТЭРЫЯЛЫ КРУГЛАГА СТАЛА, ПРЫСВЕЧАНАГА 125-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА ШЧАКАЦІХІНА

13 кастрычніка 2021 г. споўнілася 125 год з дня нараджэння Мікалая Мікалаевіча Шчахаціхіна (1896 – 1940) – вучонага і тэарэтыка культуры Беларусі – мастацтвазнаўцы, гісторыка, культуролага, педагога, стваральніка навуковай базы нацыянальнага мастацтвазнаўства. Упершыню М. М. Шчакаціхін выпрацаваў навуковую канцэпцыю гісторыі беларускага мастацтва, раскрыў асноўныя напрамкі яго развіцця і арганічна ўключыў ў кантэкст еўрапейскай культуры. Навуковая дзейнасць М. М. Шчакаціхіна па даследаванні мастацкай спадчыны Беларусі стала фундаментам далейшага развіцця айчыннага мастацтвазнаўства.

Пасяджэнне праводзілася 4 лістапада 2021 года ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У абмеркаванні прынялі ўдзел навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і іншых устаноў. На круглым стале абмяркоўваліся пытанні жыццёвага шляху і навуковай дзейнасці М. М. Шчакаціхіна, яго даследаванні ў галіне архітэктуры, выяўленчага і народнага мастацтва, нумізматыкі Беларусі, ролі навуковай спадчыны М. М. Шчакаціхіна для сучаснага беларускага мастацтвазнаўства.

У выступленні Марыі Мікалаеўны Віннікавай раскрыта значэнне навуковага метаду М. М. Шчакаціхіна для музейнай практыкі і сучаснага мастацтвазнаўства.

Алег Анатольевіч Трусаў падкрэсліў значэнне навуковай дзейнасці даследчыка-першапраходца беларускага мастацтвазнаўства.

Фотакарэспандэнт Юрый Сяргеевіч Іваноў выступіў з кароткім паведамленнем пра нашчадкаў М. М. Шчакаціхіна.

Пра даследаванне М. М. Шчакаціхіным магілёўскай школы гравюры паведаміла Алена Мікалаеўна Пікулік.

Грунтоўны даклад пра жыццё і творчасць М. М. Шчакаціхіна зрабіла Тамара Віктараўна Габрусь. Яна адзначыла, што даследчык паклаў пачатак навуковай атрыбуцыі помнікаў архітэктуры і мастацтва, іх канкрэтнай стылявой прыналежнасці ў еўрапейскім кантэксце.

Аналізу М. М. Шчакаціхіным формы як асновы канстытуалізацыі беларускага мастацтва прысвяціла сваё выступленне Вольга Дзмітрыеўна Бажэнава.

Пра незавершаны рукапіс М. М. Шчакаціхіна, прысвечаны гісторыі манет Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVII стст. і тапаграфіі старажытных літоўскіх скарбаў, паведаміла Надзея Міхайлаўна Усава.

Армэн Сяргеевіч Сардараў, раскрываючы навуковую пазіцыю даследчыка беларускага мастацтва, адзначыў яе актуальнасць як прыклад для сапраўднага навуковага пошуку новых ведаў пра творы культуры і мастацтва Беларусі.

Такім чынам, выступленні данеслі шмат новага з навуковай спадчыны М. М. Шчакаціхіна, паказалі, што даследаванне яго творчасці не спыняецца, адкрываюцца новыя старонкі і факты.

***Віннікава М. М.***

## ЗНАЧЭННЕ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫХ РАСПРАЦОВАК М. М. ШЧАКАЦІХІНА ДЛЯ СУЧАСНАГА МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА І МУЗЕЙНАЙ ПРАКТЫКІ

Дзве важныя даты мы адзначаем адну за адной: 13 кастрычніка 2021 г. – 125-годдзе з дня нараджэння Мікалая Мікалаевіча Шчакаціхіна, а 30 студзеня 2022 г. – 100-годдзе заснавання Інстытута беларускай культуры. У Інбелкульце Мікола Шчакаціхін пачаў працаваць у 1925 г. Пасля яго рэарганізацыі 13 кастрычніка 1928 г. у Беларускую акадэмію навук вучоны працягваў у ёй плённую працу да арышту ў ліпені 1930 г. Цікавае супадзенне: Беларуская акадэмія навук з’явілася ў дзень нараджэння М. М. Шчакаціхіна. Простая арыфметыка дазваляе высветліць, у якім маладым узросце Мікола Шчакаціхін прыйшоў у навуку, а агляд зробленага ім здзіўляе шырынёй навуковых інтарэсаў, глыбінёй ведаў і маштабнасцю пастаўленых мэт.

Ужо ў 1928 г.убачыў свет першы том кнігі М. М. Шчакаціхіна «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва». На думку аўтара, яна павінна была стаць першым крокам у стварэнні поўнай гісторыі развіцця беларускага мастацтва, ахапіўшы ўсе віды і формы яго праяўлення, у тым ліку і «чыста народнае, вясковае мастацтва, з яго цікаўнай орнамэнтыкай у разьбярстве, ткацтве і гафтаваньні, развіццё якой цягнецца і да нашага часу» [1, с. 9]. Карані ж народнага мастацтва М. М. Шчакаціхін бачыў у далёкай мінуўшчыне і

параўноўваў арнамент на археалагічных прадметах з арнаментам на этнаграфічных рэчах: «Але варта ўвагі, што частка гэтых рысункаў мае супольныя рысы з сучаснай народнай орнамэнтыкай, што, можа, і не выпадкова, але сьведчыць аб пэўнай традыцыйнай сталасьці народных орнамэнтальных мотываў <…> Усе гэтыя мотывы шырока вядомы ў сучасным беларускім ткацтве, пераважна ў паяскох, дзе яны, магчыма, і зьяўляюцца вынікам старадаўніх дэкорацыйных традыцый, корані якіх схаваны яшчэ ў глыбіні кургановае эпохі» [1, с. 41].

Узвышаная ідэя стварэння самабытнага беларускага савецкага мастацтва, якой былі апантаны супрацоўнікі Інбелкульта, прыцягвала да гэтай установы лепшыя навуковыя і творчыя сілы маладой рэспублікі. М. М. Шчакаціхін, які быў сакратаром секцыі выяўленчага мастацтва, разумеў неабходнасць далучэння сучасных мастакоў да вытокаў гісторыі і культуры народа, дзе яны маглі б чэрпаць натхненне для сваіх твораў. Гэтую праблему ён закрануўу артыкуле «Народнае мастацтва ў Савецкім Саюзе» [2], дзе на падставе матэрыялаў, што экспанаваліся ў Маскве на юбілейнай выстаўцы «Мастацтва народаў СССР», прааналізаваў творчасць майстроў розных рэспублік. Пры гэтым адзначыў поспехі тых рэспублік, дзе была добра наладжана саматужная прамысловасць, майстры якой абапіраліся на даўнія традыцыі свайго народа. Да такіх аднесіў Украіну і Узбекістан.

Пра мастацтва, прадстаўленае ў беларускім раздзеле выстаўкі, М. М. Шчакаціхін пісаў: «У параўнаньні да большасьці іншых краін, яно асабліва вызначаецца сваім выключна народным, пераважна сялянскім характарам» [2, с. 154]. Пры гэтым адзначаў: «Важнае месца сярод беларускіх мастацкіх вырабаў займае тканіна і гафтаваньне. Найболей характэрныя ўзоры маюць традыцыйную геомэтрычную орнамэнтыку <…> а часткова з’яўляюцца ўжо і некаторыя новыя колеры, а таксама новыя, напрыклад, расьлінныя мотывы орнамэнтыкі, значна меней строгія і меней тыповыя» [2, с. 155 – 156].

Разбурэнне і знікненне помнікаў старажытнага мастацтва, хуткія змены ў беларускай народнай культуры непакоілі М. М. Шчакаціхіна і раней. У 1926 г. быў надрукаваны яго артыкул «Спосабы зьбіраньня матэр’ялаў з беларускага мастацтва» [3], у якім аўтар заклікаў«ратаваць і захоўваць для навукі яго рэшткі, якія часта ўжо і цяпер утвараюць сабой як быццам нейкую “жывую гісторыю” нашага народу і яго ранейшага культурнага жыцця» [3, с. 62]. А для гэтага М. М. Шчакаціхін распрацаваў дакладную методыку для збору і апісання прадметаў ткацтва, разьбярнай арнаментыкі, помнікаў

старажытнага мастацтва: архітэктуры (будаўніцтва), жывапісу (малярства), скульптуры (разьбярства), а таксама помнікаў прыкладнога мастацтва.

Напрыклад, у анкеце для збірання ўзораў ткацтва ён прапанаваў наступныя формы збору: фотаздымкі, замалёўкі, самі тканіны. Пры гэтым патрабавалася абавязковае апісанне зафіксаваных ці сабраных рэчаў па наступным плане:

«1. Назва мясцовасці (горад, мястэчка, сяло, вёска, якога раёну і акругі).

2. Як далёка знаходзіцца мясцовасць гэтая ад чыгункі, ад гораду? Ці шмат асоб займаюцца ў гэтай мясцовасці ткацтвам або гафтаваннем? Ці прадаюць свае вырабы, ці робяць іх для ўласнага ўжытку?

3. Назва зарысаванага прадмету (тканіна, посцілка, ручнік, гунька, паясок, намётка і г. д.).

4. Хто яго рабіў (імя, прозвішча і па бацьку, калі не мясцовы чалавек, дык адкуль родам)?

5. Ці не мае рысунак спецыяльнай назвы ў мясцовай мове (напр. “капыцікі”, “ланцужок”, “ёлачкі”, “у лусачку” і г. д.)?

6. Адкуль узяты рысунак аўтарам (выдумаў сам, пазычыў у суседа, узяў з друкаванага рысунку, рысунак з даўных часоў ужываецца ў данай мясцовасці і г. д.).

7. З якога матэрыялу зроблена тканіна (з нітак пакупных, свайго вырабу, ільняных, ваўняных і г. д.)?

8. Чым хварбаваны ніткі? (Калі хварбай свайго вырабу, дык паказаць, як яна завецца, з чаго і як робіцца).

9. Якія назвы маюць у мясцовай мове тыя колеры, якія сустракаюцца ў рысунку?» [3, с. 63].

Акрамя такога падрабязнага апісання зафіксаванай рэчы, аўтар анкеты лічыў неабходным збіраць у кожнай мясцовасці ўсе звесткі, якія датычацца тэхнік вырабаў, назвы ткацкіх прылад, тэхнічныя тэрміны. Ён лічыў таксама важным высвятляць, ці з’яўляецца аўтар мясцовым ураджэнцам і ці не запазычаны ім рысунак з якога-небудзь чужаземнага ўзору.

Распрацаваная М. М. Шчакаціхіным методыка збору і навуковай апрацоўкі звестак пра помнікі мастацтва і традыцыйнай культуры застаецца актуальнай і ў нашы дні. А для яго тагачасных паплечнікаў – мастакоў, этнографаў, супрацоўнікаў музеяў – гэта была дакладная інструкцыя для працы; у выніку нам у спадчыну засталіся не толькі ўнікальныя аўтэнтычныя рэчы, якія трапілі ў музеі, але і каштоўныя фотаздымкі, творы графікі і жывапісу, дзе адлюстраваны як асобныя прадметы народнага адзення і

побыту, так і агульныя гістарычныя вобразы традыцыйнага асяроддзя, тыпажы жыхароў Беларусі. Сярод такіх твораў можна назваць альбомы Міхася Філіповіча з замалёўкамі ўзораў беларускіх народных тканін і адзення (малюнак 1), паясоў (малюнак 2) і віцебскай набойкі, а таксама народных пернікаў, драўлянай разьбы, традыцыйных беларускіх хат [4, с. 39 – 41].



Малюнак 1. М. Філіповіч. Народныя строі Чэрвеньскага раёна. З альбома «Народныя касцюмы» (са збору аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі: КП-5827 / КГ-40)



Малюнак 2. М. Філіповіч. Пояс Мазырскага р-на. З альбома «Народныя касцюмы» (са збору аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі: КП-4502 / КГ-8)

Дзесяць з гэтых альбомаў на сённяшні дзень захоўваюцца ў аддзеле старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, адзін – у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Цікавыя партрэтныя замалёўкі беларускіх сялян у традыцыйным адзенні, зробленыя М. Філіповічам, знаходзяцца ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь [5, с. 14 – 17], як і дакладныя этнаграфічныя малюнкі Гаўрылы Аўчыннікава [5, с. 8], Міхаіла Эндэ [5, с. 9 – 13], Язэпа Драздовіча [5, с. 128 – 145] і іншых. На некаторых з гэтых малюнкаў настолькі скрупулёзна перададзены асаблівасці беларускіх строяў, жаночых галаўных убораў, наогул беларускіх тыпажоў, што яны могуць паспяхова выкарыстоўвацца ў наш час пры стварэнні музейных экспазіцый і сцэнічных вобразаў, а таксама даюць падставы для навуковых рэканструкцый у галіне традыцыйнага беларускага касцюма. Так, паводле малюнка Язэпа Драздовіча, зробленага ім у 1926 г. у мястэчку Сернікі Пінскага павета Палескага ваяводства (зараз адносіцца да Зарачанскага раёна Ровенскай вобласці ва Украіне) [5, с. 128], аўтарам дадзенага артыкула быў адноўлены страчаны на

сённяшні дзень спосаб нашэння жаночага галаўнога ўбору наміткі [6, с. 356 – 357, 359 – 360].

Неацэнны ўклад у справу захавання традыцыйнай спадчыны ўнеслі этнаграфічныя экспедыцыі, наладжаныя Інбелкультам у розныя раёны Беларусі. Іх вынікам сталі не толькі рэчавыя набыткі, што папоўнілі музейныя зборы, але і фатаграфічныя калекцыі. Адна з такіх экспедыцый адбылася ў 1928 г. пад кіраўніцтвам Вацлава Ластоўскага, які на той час быў загадчыкам кафедры этнаграфіі пры Інбелкульце і адначасова дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея. Экспедыцыя праходзіла па маршруце Слуцк – Асташкавічы і ахоплівала асобныя тэрыторыі Слуцкай, Мазырскай і Бабруйскай акруг. На фотаздымках, зробленых падчас экспедыцыі, адлюстраваны сяляне ў традыцыйным святочным і будзённым адзенні (малюнак 3, 4), а таксама асобныя прадметы народных строяў і ручнікі. На фатаграфіях можна ўбачыць розныя тыпажы беларусаў, а таксама рэчы, якія ўжо даўно зніклі з ужытку, і толькі адзінкі з іх захаваліся ў музейных калекцыях. Напрыклад, такія як жаночы чапец з круглым донцам, багата аздобленым раслінным арнаментам, вышытым адвольнай гладдзю; здымны каўнерчык «брыжы», аздоблены ажурнай вышыўкай «сакаленнем», мужчынская шапка-валёнка «кучма» і іншыя.






Малюнак 3. Група моладзі з в. Анісавічы Мазырскай акругі ў святочны дзень (тэрыторыя Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), 1928 г.

Малюнак 4. Старыя жанчыны з в. Лампекі каля Даманавіч (тэрыторыя Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), 1928 г.

Фота экспедыцыі пад кіраўніцтвам В. Ластоўскага

Падчас Другой сусветнай вайны дадзеная калекцыя фатаграфій была вывезена з тэрыторыі Беларусі. Дзякуючы намаганням прафесара Адама Мальдзіса на радзіму вернуты копіі 270 фотаздымкаў у выглядзе мікрафільма [7, с. 83]. Зараз ужо ў алічбаваным выглядзе гэтыя копіі захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [8].

Усе матэрыялы, сабраныя падчас этнаграфічных вандровак па Беларусі ў першай палове XX ст. (замалёўкі, фатаграфіі, музейныя прадметы), уяўляюць сабой найкаштоўнейшы скарб для вывучэння і годнай прэзентацыі нашай культурнай спадчыны ў выданнях і музейных экспазіцыях (малюнак 5), а таксама для аднаўлення лепшых мастацкіх традыцый на новым узроўні і ўвядзення іх у сучасны ўжытак. У гэтым бачыцца працяг працы, пачатай Мікалаем Мікалаевічам Шчакаціхіным у 1920-я гады.



Малюнак 5. Сучасная прэзентацыя калінкавіцкага дзявочага строю [9, с. 201]

## ЛІТАРАТУРА

1. Шчакацiхiн, М. М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. М. Шчакацiхiн. – Мiнск : Навука і тэхніка, 1993.– 336 с.

2. Шчакацiхiн, М. М. Народнае мастацтва ў Савецкім Саюзе / М. М. Шчакацiхiн // Полымя. – 1928. – № 5. – С. 143 – 157.

3. Шчакацiхiн, М. М. Спосабы зьбіраньня матэр'ялаў з беларускага мастацтва / М.М. Шчакацiхiн. // Наш край: штомесячнік Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускае культуры. – 1926. – № 2–3. – С. 62 – 69.

4. Шматаў, В. Ф. Міхась Філіповіч / В. Ф. Шматаў.– Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 100 с.

5. І рай і боль на Песеннай Зямлі… Беларусь вачыма мастакоў 1920–1930-х гадоў : альбом / склад. Н. В. Мартынава. – Мінск : БелЭн, 2020. – 208 с.

6. Віннікава, М. Головні убори в традиційному жіночому костюмі білорусько-українського пограниччя (Західне Полісся) / М. Віннікава // Народознавчі зошити. – 2018. – № 2. – С. 353 – 362.

7. Лабачэўская, В. А. Архіў забытай экспедыцыі Вацлава Ластоўскага 1928 года па маршруце Слуцк – Асташкавічы / В. А. Лабачэўская // Культура и быт белорусов в этнографических исследованиях и музейных коллекциях : материалы междунар. науч. конф., Минск, 7–8 июня 2012 г. / НАН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы, Рос. этнографический музей ; гл. ред. А. И. Локотко. – Минск, 2012. – С. 83 – 86.

8. Фотографіі экспэдыцыі катэдры этнографіі. Летам 1928 году пад кіравецтвам В. Ластоўскага по маршруту Слуцак-Осташковічы адбытай [Электронны рэсурс]. – Мінск : [б. в.], 2002. – 1 электрон. Апт. Дыск (CD-ROM).

9. Віннікава, М. Традыцыйны беларускі касцюм = Традиционный белорусский костюм = Traditional belarussian costume: альбом / М. Віннікава, П. Богдан. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 302 с.

***Трусаў А. А.***

## МІКОЛА ШЧАКАЦІХІН – ПЕРШЫ ДАСЛЕДЧЫК БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА

Гэтай восенню мы адзначаем дзве вельмі важныя даты ў гісторыі беларускай культуры і мастацтва. У кастрычніку споўнілася сто гадоў з часу стварэння Інстытута беларускай культуры і 125 гадоў з дня нараджэння

ўнікальнага чалавека, гісторыка мастацтва і архітэктуры, выкладчыка і педагога Мікалая Шчакаціхіна.

Калі ён апынуўся на Беларусі, прыехаўшы сюды з Расіі, то так захапіўся нашай культурай, гісторыяй і мовай, што ўжо ў 1923/1924 вучэбным годзе, будучы выкладчыкам БДУ, прачытаў па-беларуску для студэнтаў універсітэта ўпершыню курс па гісторыі беларускага мастацтва, пачынаючы з эпохі неаліту. Стаўшы дацэнтам БДУ ў 1925 г., ён быў запрошаны на працу ў Інстытут беларускай культуры, дзе стварыў Камісію па гісторыі мастацтва і паставіў пытанне аб стварэнні ў Беларусі вышэйшай мастацкай школы альбо акадэміі.

Адначасова М. Шчакаціхін вывучаў помнікі старажытнага дойлідства ў Полацку і Мінску і збіраўся напісаць і выдаць пяць тамоў па гісторыі беларускага мастацтва. Першы том, які разглядае гісторыю нашага мастацтва ад старажытнасці да XVI ст., выдала ў 1928 г. друкарня Інбелкульта пад рэдакцыяй Вацлава Ластоўскага. У 1929 г. М. Шчакаціхін становіцца навуковым супрацоўнікам Беларускай акадэміі навук, дзе працягвае плённа працаваць.

Аднак пачаліся сталінскія рэпрэсіі, і летам 1930 г. Вучонага арыштавалі і выслалі на пяць гадоў у Башкірыю, дзе ён і памёр, маючы толькі 44 гады.

Я хачу спыніцца толькі на вывучэнні М. Шчакаціхіным беларускага мураванага дойлідства XI – XVI стст. І адзначыць яго досвед у гэтым пытанні.

Даследчык заўважаў, што першым навукоўцам, які ў 1918 – 1919 гг. вылучыў беларускае мастацтва як самастойную еўрапейскую плынь, быў нямецкі даследчык Альбэрт Іпель. М. Шчакаціхін прадоўжыў яго думку і напісаў для сваёй кнігі вялікі раздзел «Царкоўная архітэктура XI – XII стст.» Ён адзначаў вялікі ўплыў на беларускае мураванае дойлідства ў тым ліку і перапробленых правінцыяльных візантыйскіх архітэктурных формаў [1].

Акрамя таго, даследчык падрабязна апісаў муроўкі Полацкага Сафійскага сабора XI ст. і ўказаў сярэднюю таўшчыню плінфы з гэтай муроўкі (2,5 см). У якасці аналагаў прывёў муроўку кіеўскіх і чарнігаўскіх храмаў. М. Шчакаціхін дэталёва вывучаў муры і Дабравешчанскай царквы ў Віцебску. Ён адзначыў, што муроўка храма вельмі падобная да візантыйскіх узораў. Яна складаецца з тонкай даўгаватай, але часам і квадратнай плінфы, якая пакладзена разам з тоўстымі вапняковымі плітамі. Прычым два пласты цэглы чаргуюцца з вапняковым пластом, але ёсць выпадкі, калі колькасць пластоў цэглы даходзіць да трох (нават чатырох). М. Шчакаціхін пісаў: *«...у першапачатковым відзе фасады царквы не мелі аднастайнае афарбоўкі, але*

*ажыўляліся праслойкамі чырвонае цэглы па жоўта-шэрым фоне вапняку»*[1, с. 114]. Даследчык прасачыў цэглу XIV ст. у рэштках ранейшых скляпенняў храма, што сведчыла пра яго рамонт у часы Альгерда. Звярнуў увагу навуковец і на муроўку Спаса-Праабражэнскай царквы. Гэта чыста цагляная муроўка *«з асобным прыёмам машкіроўкі прамежкавых шэрагаў цэглы з дапамогай досыць шырокіх пластоў надворнага тынку»*[1, с. 121]. (Цяпер мы гэтую муроўку называем муроўкай са схаваным шэрагам.)

М. Шчакаціхін падрабязна разгледзеў будаўнічую тэхніку Каложскай царквы XII ст. Ён лічыў, што ўжыванне ў якасці асноўных дэкаратыўных элементаў сцен Каложскага храма разнастайных паліваных плітак і шліфаваных гранітных камянёў, размешчаных у пэўным парадку, мае аналогіі ў мармуровых і алебастравых аздобах, уласцівых храмам Візантыі і Усходу. Аналізуючы шматлікія галаснікі, умураваныя ў сцены царквы, М. Шчакаціхін палічыў, што некаторыя з іх, якія знаходзяцца ў сярэдніх частках сцен храма, – гэта галаснікі-рэзанатары, а тыя, што залягаюць у верхніх частках муроў, мелі яшчэ і тэхнічныя мэты. На яго думку, *«калажанская галасьніковая сыстэма, калі не цалком, дык часткова, магла мець заходняе пахаджэньне»* [1, с. 134].

Мікола Шчакаціхін быў першым беларускім даследчыкам, які звярнуў увагу на будаўнічую тэхніку нашых замкаў. Ён пісаў, што асноўныя замкавыя муры будавалі з *«груба апрацаваных вапняковых пліт, або нават з натуральнага неапрацаванага каменьня, да якога часам прымешваліся кавалкі бітае цэглы, і ўсё залівалася цэмантнай рашчынай. Чыстая цэгла ўжывалася параўнальна рэдка, і амаль што ніколі ня была выключным будаўнічым матар'ялам. Толькі ў некаторых выпадках надворным мурам надаваўся выгляд цаглянае будовы, – але гэта дасягалася з дапамогаю абліцоўкі муроў, збудаваных тэй самай вышэйпамянёнай зьмешанай кладкай»*[1, с. 144].

Грунтоўнае вывучэнне замкавага дойлідства Вялікага Княства Літоўскага дазволіла вучонаму ўпершыню вылучыць некаторыя рысы беларускай готыкі, напрыклад, паступовае ўзнікненне і развіццё гатычнай спічастай аркі і замена яе на паўцыркульную ці пашырэнне зорчатых скляпенняў.

У сваёй кнізе М. Шчакаціхін не абмінуў будаўнічую тэхніку Мірскага замка. Ён пісаў, што замак зроблены з камянёў і добра абпаленай ды роўна пакладзенай цэглы. Муроўка ўсюды вельмі моцная, а форма цэглы звычайная, падоўжаная. Яшчэ адна прыкмета беларускай готыкі, вылучаная М. Шчакаціхіным, гэта існаванне чатырохвежавага царкоўнага ці касцельнага будынка XVI ст. Фактычна М. Шчакаціхін першым вызначыў розныя напрамкі

будаўнічай тэхнікі беларускага мураванага дойлідства XI – XII і XIV – XVI стст.

## ЛІТАРАТУРА

1. Шчакаціхін, М. М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. М. Шчакаціхін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 336 с.

***Иванов Ю. С.***

## НАСЛЕДНИКИ НИКОЛАЯ ЩЕКАТИХИНА

Приятно было наблюдать единство взглядов в оценке творчества белорусского искусствоведа, теоретика искусства Николая Николаевича Щекатихина, чей юбилей отмечали на круглом столе в Центре исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси.

Выступавшие с энтузиазмом и любовью рассказывали о трудахюбиляра, который впервые в белорусском искусствоведении выработал научную концепцию истории белорусского искусства.Печальные подробности биографии Н. Н. Щекатихина раскрываются в его письме к коллеге, профессору Владимиру Пичете. В нём за год до своей смерти учёный писал: «Я больше ни о чём не мечтаю, не хочу ехать в большой центр; Я был бы удовлетворен самой маленькой, самой скромной научной работой где-нибудь в провинции, хоть и самым молодым исследователем; готов снова начать научную карьеру ассистентом, как 17 лет назад, но только для того, чтобы полностью посвятить себя любимой научной работе. Я ещё не стар – мне всего сорок два года».

Выступления учёных опровергли мысль Николая Николаевича о том, что «белорусское искусство ещё ждёт своего историка, и нельзя надеяться, чтобы эта тема могла быть окончательно разработана не только в современный момент, но даже и в ближайшем будущем», высказанную им в 1928 г. в первом томе «Очерков из истории белорусского искусства». Достижениясовременного белорусского искусства и искусствоведенияполно отражают всё многообразие процессов, происходящих в республике.

Говоря образно, искусствоведение выступает как внимательный наблюдатель и как подвижная интеллектуальная структура, позволяющая распознать и систематизировать процессуальные изменения в современном искусстве.

В 2018 г. Белорусский государственный университет культуры и искусств издал справочник персоналий «Современное искусство Республики Беларусь» (составитель – доктор искусствоведения В. П. Прокопцова). Данный справочник включает 513 статей с краткой информацией о биографическо-творческих данных деятелей искусства Беларуси конца XX – начала XXI в. Дело Николая Николаевича Щекатихина живёт и приносит свои заслуженные плоды.

*Пікулік А. М.*

## М. ШЧАКАЦІХІН – ДАСЛЕДЧЫК МАГІЛЁЎСКАЙ ШКОЛЫ ГРАВЮРЫ

Сярод разнастайных навуковых інтарэсаў М. Шчакаціхіна значнае месца належыць беларускаму мастацтву графікі. Заснавальнік беларускага мастацтвазнаўства надаваў значную ўвагу сучаснай яму кніжнай і станковай графіцы і пакінуў шэраг публікацый па гісторыі беларускай гравюры. Сярод апошніх найбольшую вядомасць атрымалі даследаванні, прысвечаныя дзейнасці Ф. Скарыны [10; 11], якія і па сённяшні момант здолелі захаваць сваю актуальнасць і ўражваюць новыя пакаленні даследчыкаў навуковай глыбінёй і ўзорнай дакладнасцю.

Цікавасць М. Шчакаціхіна да творчай спадчыны беларускага першадрукара заканамерная: было б дзіўна, калі б ён абмінуў увагай гэтую знакавую для беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння пачатку XX ст. асобу. У 1920-я гады Беларусь шырока святкавала 400-годдзе айчыннага кнігадрукавання, рыхтаваўся грунтоўны юбілейны зборнік. Ф. Скарына ўспрымаўся ў тыя часы як відавочны сімвал старажытнасці нацыянальнай мастацкай культуры, яе высокіх эстэтычных якасцей і арыентацыі на еўрапейскія культурныя каштоўнасці. Вядомы партрэт беларускага асветніка, гравюры, шрыфты і элементы кніжнай аздобы скарынаўскіх выданняў выкарыстоўваліся і ў якасці зразумелых чытачу «цытат» у кніжным мастацтве Беларусі, якое рабіла ў тыя часы першыя крокі на шляху сучаснага развіцця і нярэдка было імпульсам для асабістых творчых пошукаў мастакоў-графікаў.

Больш нечаканым стаў зварот М. Шчакаціхіна да творчасці В. Вашчанкі – аднаго з адметных мастакоў магілёўскай брацкай друкарні. У 1925 г. даследчык апублікаваў артыкул «Васіль Вашчанка – магілёўскі гравёр канца XVII – пач. XX сталецця», перадрукаваны пазней у зборніку «Магілёўшчына»

Магілёўскага акруговага таварыства краязнаўства [9]. Значэнне гэтага невялікага артыкула для далейшага вывучэння беларускага кніжнага мастацтва цяжка пераацаніць: ужо праз няпоўныя тры гады працы ў Беларусі М. Шчакаціхін не толькі палічыў магчымым гаварыць аб адметнасці беларускага выяўленчага мастацтва ў цэлым, але і прапанаваў новае паняцце для характарыстыкі рэгіянальных яго асаблівасцяў, у дадзеным выпадку – «магілёўская школа гравюры». Навуковец меў на ўвазе перш за ўсё дзейнасць мастакоў-графікаў Максіма і Васіля Вашчанкаў. Дапоўненае далейшымі даследчыкамі ўяўленне аб магілёўскай школе гравюры дайшло да нашых дзён і пераважна – у прапанаваным Шчакаціхіным кантэксце.

Нельга не адзначыць, што прысвечаны В. Вашчанку артыкул і сёння – амаль праз стагоддзе з часу свайго напісання – з'яўляецца прыкладам узорнага мастацтвазнаўчага даследавання. У 1920-я гады Беларуская кніжная гравюра ў цэлым і магілёўская кніжная гравюра XVII – XVIII стст. у прыватнасці была амаль невядомай з'явай. Пра магілёўскае брацтва пры Багаяўленскім саборы і яго друкарню пісаў у свой час гісторык царквы Ф. Жудро [1; 2]. Асобныя кнігазнаўчыя звесткі аб выдадзеных у Магілёве старадруках пакінулі рускія бібліёграфы І. Каратаеў, А. Мілавідаў, В. Сопікаў, В. Ундольскі і іншыя [3; 4; 7]. Д. Равінскі здолеў упершыню назваць прозвішчы магілёўскіх мастакоў кнігі, хаця не пазбег тут істотных памылак і склаў спіс кніг магілёўскага друку [6].

Прымаючы да ўвагі ўсе нешматлікія папярэднія звесткі, М. Шчакаціхін у сваім даследаванні ўпершыню выступае перш за ўсё з пазіцый мастацтвазнаўцы: ён паслядоўна і ўважліва аналізуе праблему мастацкай формы, звяртае пераважную ўвагу на кампазіцыйныя пошукі В. Вашчанкі, яго трактоўку прасторы, асаблівую «жывапіснасць» дрэварытаў майстра, своеасаблівы тыпаж персанажаў мастака, яго глыбока індывідуальную манеру гравіравання і г. д.

У беларускім мастацтвазнаўстве да 1920-х гадоў ніколі манаграфічна не аналізавалася творчасць асобных мастакоў старадрукаваных кірылічных выданняў – іх творы былі практычна невядомымі. Зразумела, не ставілася задача выявіць эвалюцыю іх творчасці. Тым не менш, у сваім артыкуле М. Шчакаціхін упершыню здолеў зрабіць гэта ў дачыненні да В. Вашчанкі: на падставе разгляду чатырох падпісаных мастаком ксілаграфій (тытулаў магілёўскіх выданняў 1698 – 1702 гг.) і стылістычнага аналізу 15 ананімных кніжных гравюр тых жа часоў, у якіх даследчык акрэсліў іх эвалюцыю. М. Шчакаціхін перш за ўсё арыентаваўся на індывідуальныя асаблівасці

творчасці мастака і разглядаў іх у развіцці, на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Упершыню мастацтвазнаўца не надаваў пераважнага значэння даце выхаду кнігі, справядліва мяркуючы, што кнігавыдавецтва – складаная справа і далёка не заўсёды падрыхтаванае выданне ажыццяўлялася ў запланаваныя тэрміны. Не выключаліся выпадкі, калі створаныя В. Вашчанкам дрэварыты маглі быць надрукаваны пазней часу стварэння, што значна ўскладняе даследаванне яго творчасці.

Паказальнай падаецца прынцыповая пазіцыя М. Шчакаціхіна адносна дакладнасці біяграфічных звестак пра В. Вашчанку. Як вядома, майстры магілёўскай брацкай друкарні ўпершыню ў гісторыі беларускага кірыліцкага кнігадрукавання пачалі пакідаць на гравюрах свае подпісы, дзякуючы чаму мы ведаем некаторыя іх прозвішчы. Так, у прыватнасці, вядома, што ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. у друкарні адначасова працавалі два Вашчанкі – Максім і Васіль. Першы быў вядомы як грамадскі дзеяч, арганізатар і арандатар друкарні, аўтар шматлікіх медзярытаў з тагачасных магілёўскіх выданняў. Другі вядомы выключна сваімі падпісанымі і непадпісанымі дрэварытамі, самыя познія з якіх былі надрукаваны ў 1730 г., а таксама падпісаным антымінасам 1708 г. [5, с. 128 – 129]. Цяжка ўявіць, што аднолькавыя прозвішчы мастакоў – супадзенне: паміж імі, напэўна, існавалі роднасныя сувязі. З лёгкай рукі Ф. Жудро, які ўпершыню назваў Васіля Вашчанку сынам Максіма [3, с. 98], гэтаемеркаванне трывала ўвайшло ў мастацтвазнаўчую літаратуру, хаця дакументальных пацвярджэнняў мы дагэтуль не маем. М. Шчакаціхін, які, як вядома, заўсёды асцярожна і ўважліва ставіўся да даставернасці фактаў, нідзе і ніколі не называў Максіма і Васіля бацькам і сынам і ўжываў толькі слова «родзічы» [9, с. 123].

Далейшае вывучэнне дзейнасці магілёўскай брацкай друкарні XVII – XVIII стст. пераканаўча паказала, што пераважная большасць меркаванняў М. Шчакаціхіна пацвердзілася [5, с. 54 – 67]. Тым не менш, ёсць выпадак, калі даследчык, здаецца, памыліўся. Ён упэўнена аднёс да твораў В. Вашчанкі дрэварыт «Ушэсце Багародзіцы» з «Ірмалоя» 1700 г. Між іншым, на ілюстрацыі ёсць подпіс, які, відавочна, М. Шчакаціхін не заўважыў. Ініцыялы у левым ніжнім вуглу гравюры не пакідаюць сумненняў, што аўтарам гэтага твора быў Фёдар Ангілейка. Пазней у выніку вывучэння магілёўскіх выданняў канца XVII – пачатку XVIII ст. усяго было выяўлена 8 падпісаных гравюр Ф. Ангілейкі і каля 20 непадпісаных твораў, якія маглі належаць яго творчасці [5, с. 67 – 74].

Сёння, амаль праз стагоддзе пасля публікацыі артыкула М. Шчакаціхіна, пра дзейнасць магілёўскай брацкай друкарні пры Багаяўленскім манастыры нам вядома больш. За час існавання друкарні (г. зн. з 80-х гг. XVII ст. па 80-я гг. XVIII ст.) з яе сцен выйшла каля 40 кірыліцкіх выданняў, пераважная большасць з якіх была падрабязна ілюстраваная. Упершыню ў гісторыі беларускай кірылічнай кніжнасці гравюры стваралі своеасаблівую і падрабязную выяўленчую паралель тэксту. Мастакі друкарні першы раз пакінулі на сваіх творах подпісы, дзякуючы чаму мы ведаем прозвішчы Максіма і Васіля Вашчанкаў, Фёдара Ангілейкі, Афанасія П. (Пігарэвіча?). Старонкі магілёўскіх брацкіх выданняў упершыню адначасова былі ўпрыгожаны традыцыйнымі дрэварытамі і новымі для кірыліцкіх старадрукаў медзярытамі. Узнікшы на плённым сумежжы, на спалучэнні праваслаўна-візантыйскай і каталіцка-раманскай культур, якія ўступалі ва ўзаемадзеянне з мясцовым эстэтычна-стрыманым варыянтам барока і знаходзіліся пад уплывам моцных фальклорных традыцый, магілёўскія кніжныя гравюры перарастаюць па сваім значэнні рамкі вузкай рэгіянальнай школы і з’яўляюцца значным укладам у агульнае развіццё беларускага выяўленчага мастацтва. Уяўленне аб гэтай з’яве пачалося і дагэтага часу шмат у чым грунтуецца на артыкуле М. Шчакаціхіна.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Жудро, Ф. Богоявленский братский монастырь в г. Могилёве / Ф. Жудро. – Могилёв : Тип. Могилёвского губернского правления, 1899. – [2]? 51 с. [1] л. ил.
2. Жудро, Ф. История Могилёвского Богоявленского братства / Ф. Жудро. – Могилёв-на-Днепре : Скоропечатня и литография Ш. Фридланда, 1890. – 112 с.
3. Каратаев, И. П. Хронологическая роспись славянских книг, напечатанных кирилловскими буквами. 1491 – 1730 / И. П. Каратаев.– СПб. : Тип. Академии наук, 1861. – XIX, [5], 228 с.
4. Миловидов, А. И. Описание славяно-русских старопечатных книг Виленской публичной библиотеки (1491 – 1800) / А. И. Миловидов. – Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1908. – 160 с.
5. Пікулік, А. М. Мастацтва магілёўскіх старадрукаў /А. М. Пікулік. – Мінск : Тэхнапрынт, 2002. – 199 с.
6. Ровинский, Д. Русские гравёры и их произведения с 1564 г. до основания Академии художеств /Д. Ровинский. – М. : Уварова, 1870. – 404 с.

7. Сопиков, В. С. Опыт российской библиографии: в 5 ч. / В. С. Сопиков. – СПб. : Изд. А. С. Суворина, 1904 – 1908. – Ч. 1 – 5.

8. Ундольский, В. М. Очерк славяно-русской библиографии / В. М. Ундольский ; с доп. А. Ф. Бычкова, А. Викторова. – М. : Московский публичный и Румянцевский музеи, 1871. – [4], IV с., 338 с.

9. Шчакаціхін, М. Васіль Вашчанка – магілёўскі гравёр канца XVII – пач. XVIII сталецця / М. Шчакаціхін. –Мінск : [б. в.], 1925. – С. [2], 123 –135, [9] л. іл.

10. Шчакаціхін, М. Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны / М. Шчакаціхін. – Мінск : Ін-т беларускай культуры, 1926. – 50 с., [36] л. іл.

11. Шчакаціхін, М. Да пытання аб храналогіі «Малой падарожнай кніжыцы» Скарыны: Scoriniana : [артыкул] / М. Шчакаціхін. –Мінск : [б. в.], 1928. – С. 435 – 450.

***Габрусь Т. В.***

## КРАЕВУГОЛЬНЫ КАМЕНЬ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА: ДА 125-ГОДДЗЯ МІКОЛЫ ШЧАКАЦІХІНА

Калі паслядоўна выпрацоўваецца дакладна структураваная сістэма ведаў, назапашаных чалавекам, яе звычайна параўноўваюць з будынкам. Невыпадкова існуе крылаты выраз «будынак навукі», які, як і кожны будынак, каб надзейна трымацца, мусіць мець свой падмурак. Своеасаблівым краевугольным каменем у падмурку гісторыі архітэктуры Беларусі і нават усяго беларускага мастацтвазнаўства стаў выдатны вучоны, пакутнік за ідэю айчыннага нацыянальнага мастацтва Мікола Шчакаціхін, 125-гадовы юбілей якога адзначаецца сёлета.

На мяжы XVIII – XIX стст. у Расійскай імперыі пачалося навуковае вывучэнне нацыянальнай рускай культурнай спадчыны, якая стала аб'ектам пільнай увагі грамадства і грунтам для фарміравання адметных напрамкаў у гісторыі архітэктуры ў кантэксце ідэалогій заходніцтва і славянафільства [1]. Вядомымі расійскімі вучонымі А. С. Уваравым, Н. П. Кандаковым, А. М. Паўлінавым былі зроблены першыя спробы натурнага вывучэння і графічнай фіксацыі збудаванняў, распрацаваны метад датавання старажытных помнікаў на падставе аналізу асаблівасцей муроўкі. Галоўная ўвага надавалася вывучэнню пісьмовых і археалагічных гістарычных крыніц. Крыху пазней, з сярэдзіныXIX ст., аб'ектам цікавасці расійскіх гісторыкаў рэлігіі, археолагаў і

мастацтвазнаўцаў сталі таксама помнікі ўкраінскага дойлідства. Пачала фарміравацца ўласна ўкраінская архітэктуразнаўчая школа. Але беларуская мастацкая культура па-ранейшаму заставалася «белай плямай» альбо «чорнай дзіркай» расійскай дарэвалюцыйнай навукі.

